# Вопыт масквічоў

*Нядаўна Нацыянальная бібліяшэка Беларусі атрымала ў падарупак ад масквічоў 2500 кніг разпастайпай тэматыкі. Падчас урачыстай цырымопіі, якая праходзіла ў межах Дзён Масквы ў Рэспубліцы Беларусь, думкамі пакопт развіцця бібліятэчнай справы і пазапашапым вопытам у рэалізацыі разпастайпых бібліятэчных праграм падзялілася дырэктар маскоўскай Цэптральыіай гарадской публічнай бібліятэкі імя М. Някрасава Святлапа Просекава.*



Як зазначыла спадарыня Просекава, бібліятэкі Расіі адраджаюцца. Паспрыяла таму пасланне Прэзідэнта У. Пуціна Федэральнаму сходу, у якім пастаўлены задачы адраджэння бібліятэчных устаноў, павышэння сацыяльнага і прафесійнага ўзроўню бібліятэкара, камп'ютэрызацыі і пераабсталявання храмаў кнігі.

Сёння, па словах Святлаыы Мікалаеўны, у Расіі распрацоўваецца сістэма мер па стварэнні спецыфічных праграм, ініцыятарам якіх у многіх выпадках з'яўляюцца масквічы. Напрыклад, у расійскай сталіцы ўводзіцца адзіны пластыкавы чытацкі білет. Асобная праграма скіравана на абслугоўванне спецыфічных катэгорый грамадзян — іывалідаў, пажылых, шматдзетных сем'яў. Нават ствараюцца працоўныя месцы для вучняў старэйшых класаў і студэнтаў, якія будуць па запыце дастаўляць кнігі з бібліят:жпадом.



Яшчэ адзін праект — стварэнне зводнага электроннага бібліятэчнага каталога ўсіх маскоўскіх кнігафондаў. Таксама разглядаецца магчымасць арганізацыі заказу кніг праз Інтэрнет.

— Шэсць гадоў таму я абвясціла праз СМІ пачатак дабрачыннай акцыі "Масква — рэгіёнам Расіі", — расказвае Святлана Мікалаеўна, — прапанавала выдаўцам лішкі друкаванай прадукцыі і літаратуру, якая не надта прадаецца, перадаваць бібліятэкарам, каб тыя змаглі папоўніць фонды. Звярталася і да простых грамадзян. У першы год наша Някрасаўка сабрала каля 76 тыс. кніг, а ў наступныя — больш як 100 тыс. Да іх дадайце кнігі, якія выпушчаны за дзяржаўныя сродкі спецыяльна для рэгіёнаў.

У чым значнасць падобнай задумы? Мы аб'ядналі вакол бібліятэкі выдаўцоў. Калі не хапае экземпляраў па той ці іншай пазіцыі, выдаецца дадатковая колькасць кніг, і ўсё роўна застаюцца лішкі прадукцыі, якія варта перадаваць бібліятэкам. Таму такія падарункі на карысць і нам, і выдаўцам, якія атрымліваюць за гэта ўрадавыя граматы, ухвальныя лісты за подпісамі высокіх афіцыйных асобаў...

— Думаю, сёння прыйшоў час абудзіцца бібліятэчнаму грамадству! — падкрэсліла Святлана Просекава.

Таксама яна выказалася за далейшае развіццё супрацоўніцтва з беларусамі. Падарунак масквічоў — не спісаная літаратура, а толькі самыя лепшыя выданні!

**Сяргей ДУБОВІК**